І. І. БАМБЕШКА

# ПРЫВАТНЫ СЯДЗІБНЫ ЗБОР ТЫШКЕВІЧАЎ У ЛАГОЙСКУ / TIŠKEVIČIŲ DVARO KOLEKCIJA Į LOHOYSK

I. BAMBESHKA

# PRIVATE ESTATE COLLECTION OF TYSHKEVICH IN LAGOYSK

*The article analyzes the process of creating one of the largest collection of Manor on the territory of Belarus in the first half of XIX century. Define the structure and composition of the collection, its main ways of forming and using items. Provides information about the fate of a collection K. and Y. Tyshkevich.*

У першай чвэрці XIX ст. уладальнікам лагойскага маёнтка Піем Феліцыянавічам Тышкевічам (1756–1858) былі распачаты пераўтварэнні сядзібы: будаўніцтва двухпавярховага мураванага палаца ў стылі класіцызму (пабудаваны ў 1815 г.) і закладка вакол яго парка. Па даных інвентара (1844) лагойскага маёнтка, непасрэдна на тэрыторыі палацава-паркавага комплексу і побач знаходзіўся шэраг будынкаў рознага гаспадарчага прызначэння. Лагойскаму маёнтку таксама належалі карчма ў мястэчку, вадзяны млын на рацэ Гайне, дом на Плешчанскай вуліцы, у якім размяшчаўся палатняны завод, і іншыя гаспадарчыя пабудовы [14, с. 175]. У сярэдзіне – другой палове XIX ст. у склад сядзібна-паркавага комплексу была ўключана тэрыторыя былога гарадзішча – паўночная вялікая і найбольш старажытная частка «замка лагойскага» XV–XVII стст. [5; 2, с. 30].

Кампазіцыйным цэнтрам маёнтка быў палац, пабудаваны Піем Тышкевічам на месцы старажытнага замчышча і драўлянага замка Чартарыйскіх (разбураны татарамі ў 1505 г.), потым мураванага замка Тышкевічаў (разбураны шведамі ў 1708 г.) [16, с. 361]. Новы палац з'яўляўся адным з першых збудаванняў у Беларусі з раскрытай франтальнай кампазіцыяй (аналагічныя палацы ў той жа час былі ўзведзены ў Гомелі, Паланечцы і Снове) [14, с. 175; 8, с. 72]. Лагойскі палац – твор архітэктуры стылю ампір з выкарыстаннем элементаў дарычнага ордару.

Пра архітэктурнае аблічча палаца другой паловы XIX – пачатку XX ст. можна меркаваць па шэрагу выяўленчых і фотакрыніц: малюнак М. Янушэвіча (1857), што захоўваецца ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта; дзве работы Н. Орды (акварэль і гравюра), датаваныя 1864–1874 гг.; дрэварыт К. Тышкевіча, змешчаны ў яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы «Wilija i jej brzegi» (1871), таксама гравюра І. Краеўскага і Б. Падбельскага (1883), апублікаваная ў польскім часопісе «Tygodnik Ilustrowany» за 1883 г., наступная крыніца – ілюстрацыі да працы А. Урбаньскага «Podzwonne na zgliszczach Litwy i Rusi: 149 ilustracyj» (1928) і інш.

Палац Тышкевічаў займаў плошчу 106×28 аршын (прыкладна 70×20 м) і меў складаную франтальную структуру. Цэнтральны двухпавярховы аб'ём з шасцікалонным порцікам дарычнага ордару фланкаваўся двума аднапавярховымі крыламі, якія заканчваліся вузкімі двухпавярховымі аб'ёмамі. У плане гэтыя бакавыя аб'ёмы ўяўлялі сабой слаба выступаючыя за лінію фасада рызаліты, а завяршалі іх высокія трохвугольныя франтоны, што надавала гэтым аб'ёмам з боку галоўнага і паркавага фасадаў вобразнае аблічча. Высокі цокальны паверх цэнтральнага аб'ёму пераходзіў на паркавым фасадзе ў шырокую паўкруглую тэрасу са спускам у бок парку. Мастацкае афармленне інтэр'ераў палаца было вырашана ў стылі ампір.

Апісанняў інтэр'ераў палаца практычна не захавалася. Вядомы польскі даследчык Р. Афтаназі тлумачыць гэта тым, што ўвага мемуарыстаў XIX ст., якія наведвалі і давалі апісанні лагойскага палаца, была цалкам засяроджана на ўнікальных калекцыях прыватнага збору Тышкевічаў [17, с. 95]. Парадныя апартаменты палаца больш нагадвалі музейную анфіладу.

У 1859 г. маёнтак перайшоў да старэйшага сына П. Ф. Тышкевіча – Канстанціна, затым да яго сына – Аскара (1837–1897). Сын Аскара, Юзэф (1869–1914), быў апошнім уладальнікам маёнтка. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак нацыяналізавалі, палац і іншыя пабудовы перадалі для розных адміністрацыйна-гаспадарчых патрэб, у тым ліку і пад жыллё. У гады Вялікай Айчыннай вайны палац выкарыстоўваўся нямецкімі вайскоўцамі, а ў канцы вайны быў узарваны [2, с. 30].

Але ўладальнікі маёнтка пакінулі нашчадкам спадчыну, непамерна больш каштоўную, чым успамін аб прыгожым палацы. Найперш гэта, як пісаў адзін з Тышкевічаў, стваральнік у маёнтку музея старажытнасцей, узор служэння «айчыннай гісторыі для дабра грамадскага». Першы ўладальнік маёнтка Пій Тышкевіч шмат зрабіў для адраджэння і памнажэння культурнай спадчыны Лагойшчыны, працаваў над сямейнай хронікай, значна папоўніў хатнюю бібліятэку, калекцыю карцін, якая складалася з партрэтаў найбольш прыкметных асоб з лагойскай дынастыі, вёў хатні архіў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быў выдатным рэзчыкам па дрэве і інкрустатарам. Яго другая жонка і маці будучых рупліўцаў гісторыі культуры беларускіх земляў братоў Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў Аўгуста Тышкевіч (з роду краслаўскіх Плятараў), занятая гаспадарчымі клопатамі і выхаваннем дзяцей (акрамя Канстанціна і Яўстаха яшчэ сына Фларыяна і дачкі Паўліны), падзяляла захапленні мужа, а затым і сыноў Канстанціна і Яўстаха ў зборы твораў мастацтва, прадметаў антыкварыяту, рукапісных кніг і іншых гістарычных крыніц. Яна перавезла ў Лагойск частку краслаўскага кнігазбору [7, с. 9].

Сярод гасцей лагойскага маёнтка былі вядомыя творчыя асобы таго часу, да прыкладу кампазітар і піяніст Фларыян Міладоўскі, якога сучаснікі параўноўвалі з класікам нацыянальнай класічнай музыкі Станіславам Манюшкам, кампазітар і арганіст Восіп Казлоўскі, асабліва славуты як аўтар музыкі на матыў паланэза «Гром победы, раздавайся!» (фактычна быў неафіцыйным гімнам Расійскай імперыі. Часта гасцяваў у маёнтку знакаміты да сённяшняга часу мастак, кампазітар Напалеон Орда і многія іншыя вядомыя асобы.

Такім чынам, атмасфера, у якой выхоўваліся Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, вельмі спрыяла фарміраванню ў іх павагі да мясцовай і агульначалавечай культуры. Таму не дзіўна, што яны працягнулі калекцыянерскую справу бацькоў яшчэ ў большым маштабе. Пій Тышкевіч усяляк дапамагаў сынам у правядзенні археалагічных раскопак [7, с. 9; 13, с. 83].

Рэдкія ўспаміны асобных тагачасных наведвальнікаў лагойскага збору сведчаць, што экспазіцыйныя залы знаходзіліся на першым паверсе бакавых крылаў палаца. Для размяшчэння прадметаў калекцый былі адведзены і залы ратонды абодвух паверхаў цэнтральнага паўкруглага эркера з паркавага боку [9, с. 376]. Ю. А. Тышкевіч (уладальнік Біржайскага маёнтка) пакінуў дастаткова дакладнае апісанне збору сваіх сваякоў, ён зазначае, што калекцыя размяшчалася ў двух залах, адна з іх была большая, другая меншая [20, с. 79]. Акрамя таго, у зале-сталовай знаходзілася некалькі дзясяткаў родавых партрэтаў – гетманаў, біскупаў і архімандрытаў [9, с. 376].

Беларускі гісторык музейнай справы А. А. Гужалоўскі групуе прадметы збору Тышкевічаў наступным чынам:

а) Археалагічная калекцыя – яна была добра сістэматызавана па матэрыяле вырабу і з’ўлялася навуковым ядром збору. У ёй былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырока прадстаўлены прадметы з раскопак курганоў у Барысаўскім і Мінскім паветах. Даволі значную частку складалі жаночыя ўпрыгажэнні, а таксама попельніцы, урны, слязніцы і інш. [3, с. 28; 11]. Беларускі краязнавец XIX ст. А. Ельскі паведамляў, што прадметы жалезнага і бронзавага вякоў былі ў музеі прадстаўлены найбольш поўна [4, с. 296]. Асобна ад мясцовых старажытнасцей ў зашклёнай шафе дэманстраваліся этрускія вазы з раскопак Пампеі і Геркуланума, прадметы, выяўленыя падчас археалагічных даследаванняў М. Ю. Тышкевіча ў Егіпце (егіпецкія муміі, папірусы і г. д.). [1, с. 50].

б) Калекцыя гравюр і эстампаў – была падзелена на дзве часткі: першая ўключала творы рэлігійнай тэматыкі XVII – XIX стст., другая – партрэты гістарычных асоб, сярод якіх вылучаўся партрэт Т. Касцюшкі. У абедзвюх частках калекцыі былі прадстаўлены як знакамітыя гравёры з Англіі, Польшчы, Францыі, так і малавядомыя аўтары [3, с. 28]. Трэба сказаць, што К. Тышкевіч цікавіўся не толькі гравюрамі, якіх у яго налічвалася сотні аркушаў, але збіраў і самі гравюрныя дошкі (матрыцы). Так, крыніцы сведчаць, што ў яго зборы захоўвалася 220 адзінак медных гравіравальных дошак (пласцін) XVII ст. «літоўскай работы» [15, с. 174]. Для папаўнення калекцыі ён карыстаўся рознымі спосабамі: набываў у прыватных асоб, часта гравюры траплялі да яго з закрытых дзяржаўнымі ўладамі кляштараў, а таксама з друкарань, дзе гравюры ўжываліся для ілюстравання кніг. Збіраць гравіравальныя дошкі было дастаткова складана, паколькі пасля выкарыстання іх расплаўлялі для розных гаспадарчых патрэб [17, с. 95]. К. Тышкевіч шмат працаваў над фарміраваннем і навуковай апрацоўкай гэтай калекцыі, вынікам чаго стаў каталог гравюр, які быў апублікаваны ў 1858 г., ён утрымліваў шмат матэрыялу па беларускай іканаграфіі [21].

в) Значнай у зборы была калекцыя манет, медалёў, пячатак (агульная колькасць манет і медалёў складала 1140 адзінак). З прыведзенай колькасці 301 медаль і 119 манет датычыліся гісторыі Польшчы (Рэчы Паспалітай), астатнія ж былі замежнай вытворчасці [19, с. 272; 15, с. 174; 17, с. 96].

г) Зброя, даспехі і рыштунак. Даследчыкі называюць гэту частку збору Тышкевічаў своеасаблівым арсеналам з вялікім камплектам featureзброі [1, с. 49], таксама захоўваліся кальчугі, мундзіры, у тым ліку і часоў франка-рускай вайны 1812 г. Сярод унікальных прадметаў крыніцы згадваюць шпагу (шаблю) Пятра І, дзве шаблі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазалочанымі мініяцюрнымі выявамі Стэфана Баторыя, швецкі сцяг, заваяваныя Стэфанам Чарнецкім у 1656 г. у шведскага караля Густава, асабістыя рэчы Яна III Сабескага, Станіслава Аўгуста і інш.) [19, с. 272; 15, с. 174; 17, с. 95]. Ёсць звесткі аб тым, што адна з гармат стаяла пасярод залы нават з «муляжом» запрэжанага белага каня [10, с. 166].

Сцены другой, меншай па памерах, залы былі ўпрыгожаны карцінамі на дошках, а ў вітрынах размешчаны маршальскі жэзл, ордэны, узоры антыкварнай бронзы, срэбраны крыж італьянскай работы пачатку XVI ст., ахвяраваны Жыгімонтам I Старым касцёлу ў Гайне, узоры старых тканін, кунтушовыя слуцкія паясы і інш. [17, с. 99].

Вельмі значнай была мастацкая калекцыя, прадметы з якой часткова ўпрыгожвалі сцены палаца. Так, польскі даследчык Р. Афтаназі, спасылаючыся на апісанне Я. Тышкевіча і Ю. Тышкевіча, прыводзіць звесткі аб тым, што ў зборы захоўваліся фігуры са слановай косці, «зробленыя з вялікім талентам», пэўная колькасць гіпсавых медалёў – шэдэўраў «старажытных і тагачасных майстроў», 200 копій італьянскіх карцін, шэдэўраў скульптур, арыгіналы якіх захоўваліся ў зборах Рыма, Неапаля, Фларэнцыі, 48 копій барэльефаў Парфенона, некалькі медальёнаў з пагруднай выявай і бюсты вядомых дзеячаў Беларусі і Літвы, выкананыя мясцовым скульптарам Р. Слізенем [19, с. 272; 17, с. 97]. Таксама ў зборы Тышкевічаў у Лагойску захоўвалася вялікая колькасць эскізаў да карцін беларускіх, рускіх, літоўскіх, польскіх мастакоў: А. Арлоўскага, Я. Дамеля, В. Ваньковіча, А. Бартэльса, Ф. Смуглевіча, Я. Рустэма, Ш. Чаховіча, Ю. Пешкі і інш. Напрыклад, толькі эскізы Я. Дамеля і іншых вучняў віленскай школы жывапісу складалі некалькі альбомаў. Вялікую цікавасць выклікалі эскізы, ілюстрацыі да баек і вершаў вядомага беларускага мастака, паэта і музыканта XIX ст. А. Бартэльса. Падчас экспедыцыі на чале з К. Тышкевічам па Віліі мастак з натуры стварыў серыю малюнкаў пра звычаі мясцовага насельніцтва, лад жыцця, быт і г.д. [10, с. 166].

У лагойскім зборы былі прадстаўлены аўтапартрэты Я. Рустэма і Я. Дамеля. Акрамя таго, мелася таксама 47 карцін замежных мастакоў (А. Каналь (Каналета), Даменікіна (Domenico Zampieri), Ф. Ваўверман, Ж. Кало і інш.) [17, с. 97; 1, с. 50]. Ёсць звесткі аб тым, што ў 1846 г. К. Тышкевіч вёў перамовы аб набыцці для музея

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калекцыі карцін М. Агіньскага, якімі на той час распараджалася нявестка кампазітара [6, с. 81].

Вядома, што Тышкевічы, як і іншыя прадстаўнікі магнатаў і шляхты, фарміравалі калекцыю партрэтаў свайго роду (12 пакаленняў). Сцены сталовай залы ўпрыгожвалі некалькі дзесяткаў партрэтаў роду, да прыкладу партрэт Пія (работы Мацея Казакевіча), партрэты іншых Тышкевічаў (найбольш знакамітых – у натуральную велічыню). У большасці сваёй партрэты былі напісаны невядомымі мастакамі ў 1760–1764 гг., аднак меліся і ранейшыя [1, с. 50]. З 1921 г. калекцыя партрэтаў захоўваецца ў Museum Narodowe ў Варшаве [14, с. 183].

У 1847 г. быў пакладзены пачатак этнаграфічнай калекцыі, якую складалі ўзоры ручнікоў, сурвэтак, абрусаў, што вырабляліся на мясцовай фабрыцы ільняных і баваўняных вырабаў [3, с. 29].

Каштоўнасць уяўляла і прыватная бібліятэка, якая ў сярэдзіне XIX ст. налічвала да 3000 тамоў на розных мовах (пераважна на польскай і французскай). Не меншае значэнне для вывучэння гісторыі, пераважна мясцовай, уяўлялі рукапісы, аўтографы, граматы, колькасць якіх дакладна не вызначана, а таксама старажытныя геаграфічныя карты [19, с. 272; 17, с. 96].

Значная частка збору была папоўнена з калекцыі пляменніцы польскага караля Станіслава Аўгуста Канстанцыі (дачкі роднага брата караля Казіміра Панятоўскага і Апалоніі Чартарыйскай), якая была замужам за гетманам Вялікага Княства Літоўскага Людвікам Скумін-Тышкевічам [12; 10, с. 166].

Адпаведна перапісцы братоў Тышкевічаў, экспазіцыя іх сядзібнага музея была адкрыта для наведвальнікаў з 1842 г. [7, с. 9].

Лагойскі збор, які сучаснікі называлі «музеем старажытнасцей», ужо ў 1840-я гг. стаў шырокавядомы. Ён быў адкрыты для наведвання. Тут плённа працавалі А. Кіркор, І. Крашэўскі, П. Шпілеўскі, П. Янкоўскі і інш. [6, с. 81]. Напрыклад, І. Крашэўскі, працуючы над сваёй манаграфіяй па гісторыі старажытнага мастацтва, шырока выкарыстоўваў матэрыялы адпаведных калекцый лагойскага музея [13, с. 85]. А. Кіркор так апісваў экспазіцыю музея і аднаго з яго стваральнікаў – К. П. Тышкевіча: «Наваколлі Лагойска багатыя на старажытныя гарадзішчы, замкі і мноства курганоў, з якіх значная частка дасканала даследавана нябожчыкам, уладальнікам Лагойска графам Канстанцінам Тышкевічам. Здабытыя прадметы старажытнасцей паклалі падмурак адметнаму музею дагістарычных старажытнасцей, які і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зараз змяшчаецца ў лагойскіх палатах. Па колькасці прадметаў і навуковаму значэнню музей гэты можа быць параўнаны толькі з Віленскім і Кракаўскім універсітэтамі» [11]. Сучаснікі адзначалі, што ў прыватным музеі Тышкевічаў у Лагойску было ўсё «каталагізавана і знаходзілася ва ўзорным парадку» [4, с. 296]. Цалкам верагодна, што такі падыход да прадстаўлення назапашаных матэрыялаў быў вынікам знаёмства Яўстаха Тышкевіча з музеямі Паўночнай Еўропы (Швецыі, Фінляндыі, Даніі).

Цяжка меркаваць пра навуковасць апісання музейных прадметаў у зборы Тышкевічаў, паколькі пра гэта практычна не засталося сведчанняў. Вядома, што запісы вяліся на польскай мове, у іх часта меліся разыходжанні з народнымі назвамі рэчаў [21, с. 12]. Датаванне знаходзілася на ўзроўні развіцця тагачаснай навукі. Манеты сістэматызаваліся паводле геаграфічнага прынцыпу, аднак іх апісанне было няпоўным. Паводле каталога, усе прадметы павінны былі займаць у музеі сваё адпаведнае месца. Экспазіцыя насіла тэматычны характар [6, с. 81].

Усведамляючы ўсю важнасць сабраных матэрыялаў для развіцця навукі, К. Тышкевіч ахвяраваў іх большую частку Віленскаму музею старажытнасцей, у 1864–1868 гг. шмат прадметаў з уласнай калекцыі падараваў Маскоўскаму публічнаму і Румянцаўскаму музею, Маскоўскаму археалагічнаму таварыству, частку археалагічных знаходак перадаў у Кракаўскі музей археалогіі, калекцыю шкла эпохі Рымскай імперыі – у Museum Narodowe ў Варшаве [3, с. 29]. Астатнія калекцыі разышліся па розных музеях і прыватных калекцыях.

Між прыватнага музейнага збіральніцтва на тагачасных беларускіх землях дзейнасць Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў вылучаецца тым, што ўпершыню музейная справа была пастаўлена на сур'ёзную навуковую глебу. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пры ўдзеле вучоных у Лагойску ішла праца па фарміраванні калекцый, іх навуковай апрацоўцы, складанні каталогаў і стварэнні экспазіцыі. Гэта быў пачатак развіцця музейнай справы ў Беларусі ў лучнасці культуры і навукі і, важна, у прызначэнні калекцый менавіта для грамадскага карыстання.

*1. Акуліч, С.* Музеі братоў Тышкевічаў / С. Акуліч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1971. – № 2. – С. 49–51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Боровой, Р.* Исторический центр Логойска: хронология, структура и проблемы охраны / Р. Боровой // Архитектура и строительство. – 2008. – № 9. – С. 28–33.

3. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

4. *Ельскі, А. К.* Выбранае: пер. з пол. / Аляксандр Ельскі; укл. Н. Мазоўка і У. Казберука ; камент. У. Казберука [і інш.]; прадм. У. Казберука і К. Цвіркі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 493 с.

5. Інвентарнае апісанне маёнтка Лагойск // Лагойск: віртуальны музей. – URL: http://museum.logoysk.info/be/city-history/12-attractions/312- description-of-buildings-in-logoysk.html.

6. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

7. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны : Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с., [8] л.

8. *Кулагин, А. Н.* Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. Н. Кулагин ; АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1981. – 132, [2] с.

9. *Кулагін, А. М.* З архітэктурнай спадчыны / А. М. Кулагін // Памяць : гіст.-дак. хроніка Лагойскага р-на : у 2 кн. – Мінск: БелЭн, 2004. – Кн. 2. – С. 375–387.

10. Лагойскі музей братоў Тышкевічаў // Памяць : гіст.-дак. хроніка Лагойскага р-на : у 2 кн. – Мінск : БелЭн, 2003. – Кн. 1. – С. 165–166.

11. Лагойскі музей братоў Тышкевічаў. Ч. 2 // Лагойск : віртуальны музей. – URL://museum.logoysk.info/be/tyszkiewicz/62-archeology/1062-tyszkiewicz-brothers-museum-in-lohojsk-part2.html.

12. Род Тышкевичей // Логойский районный исполнительный комитет. – URL: http://logoysk.gov.by/old/istoriko-geograficheskaya-spravka/ rod-tyshkevichei.html.

13. *Смолік, А. І.* Граф Канстанцін Тышкевіч: вучоны, археолаг, краязнаўца / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 8. – С. 82–86.

14. *Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук; под общ. руководством. и предисл. Е. Будинаса. – Мінск : Полифакт : Лекция, 2000. – 415 с.

15. *Шпилевский, П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П. М. Шпилевский ; предисл., текстол. подгот., примеч. и коммент. С. И. Кузняевой. – Минск : Беларусь, 2004. – 250, [1] с.

16. *Штыхаў, Г. В.* Лагойск / Г. В. Штыхаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 361–362.

17. *Aftanazy, R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 1: Wojewodztwa minskie, mscislawskie, polockie, witebskie /R. Aftanazy. – Wroclaw : Ossolineum, 1991. – 37 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18.* O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej / studium archeol. przez Konstantego hreibaiego Tyszkiewicza, czlonka wielu uczonych t-w. – Berlin : [s. n.], 1868. – 287 s. : 16 tab.

*19. Tyszkiewicz, E.* Opisanie Powiatu Borysowskiego pod wzgledem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemyslowo-handlowym i lekarskim : z dod wiadom.: o obyczajach, spiewach, przyslowiach i ubiorach ludu, guslach, zabobonach i t. d. / Eustachy Tyszkiewicz. – Wilno : druk. Marcinowskiego, 1847. – 489, IV s.

*20. Tyszkiewicz, J.* Tyszkiewiciana : militaria, bibliogr., ryc., zbiory, rezydencye etc. / zebr. Jozef Tyszkiewicz. – Poznan : Wojciech, 1903. – T. 1. – XLI, 94 s.

*21. Tyszkiewicz, K.* Pomniki rytownictwa krajowego. Oddział I. Odciski z blach mniejszych, znajdujących się w Bibliotece Łohojskiej Konstantego hrabi Tyszkiewicza / K. Tyszkiewicz. – Wilno: Nakładem właściciela, drukiem A. Marcinowskiego, 1858. – 36 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ